Вінаградава Лізавета,
ДУА «Мікіціхінская сярэдняя школа
імя Героя Савецкага Саюза М.А.Ласкунова
Шумілінскага раёна», 9 клас

Я лічу, што адзінства – гэта ген, які беларусы атрымалі ў спадчыну ад продкаў.

Намалюем нацыянальны партрэт беларуса: талерантны, лагодны, гасцінны, дэмакратычны, гуманны, няпомслівы**,** весёлы, спагадлівы, працавіты. А цяпер задумаемся:хіба можа такі чалавек быць адзін,жыць сам па сабе,разлічваць толькі на свае сілы?! Не! Ніколі! Таму адзінства – гэта нацыянальная каштоўнасць, сімвал пераемнасці пакаленняў, непахіснасці нацыі, сілы і векавой мудрасці беларускага народа.

Карані адзінства трэба шукаць у адметных традыцыях, звычаях беларусаў. Давайце ўспомнім такое прыемнае нашаму вуху слова як талака. Гэта старажытны беларускі народны звычай сумеснай добраахвотнай і бескарыснай дапамогі. Напрыклад, раней так будавалі хату. Разам збіраліся ці ўсе мужчыны роду, ці ўсе мужчыны вёскі. Калі хату будавала маладая сям'я, то на талаку сыходзіліся ўсе, хто гуляў на вяселлі. Я лічу, што гэты звычай ў вёсках жыве і сёння.Няхай не ў такіх маштабах, але ёсць. У жніўні і верасні беларусы - вяскоўцы аб'ядноўваюцца, каб выкапаць бульбу, свой «другі хлеб». Стоячы пасярод поля з кошыкам у руках, яны, можа, і не здагадваюцца, што працягваюць старажытны беларускі звычай. Але так яно і ёсць.

Такія паняцці як адзінства, еднасць, салідарнарнасць, узаемадапамога, падтрымка знаёмыя нам з дзяцінства. Побач з такімі каштоўнасцямі як патрыятызм, незалежнасць, свабода яны ўтвараюць наш нацыянальны код. Таму адказ на пытанне, што такое адзінства, нам, беларусам, знайсці нескладана. Усё гэта трывала ўплецена ў нацыянальныя сімвалы. У кожным слупку гімна Рэспублікі Беларусь гучыць ідэя адзінства нацыі «слаўся, народаў братэрскі саюз», «разам з братамі мужна вякамі мы баранілі родны парог», «дружба народаў – сіла народаў – наш запаветны, сонечны шлях». Арнамент на флагу – увасабленне старажытнай культуры беларускага народа, яго духоўнага багацця і ўнутранай сілы. У выяве герба адлюстроўваюцца асноўныя нацыянальныя і духоўныя каштоўнасці беларусаў: грамадзянскае адзінства, працавітасць, міралюбнасць. У цэнтры – контур Беларусі, які сімвалізуе непарушны суверэнітэт і тэрытарыяльнае адзінства краіны. Адным словам, гэта ўсё тое, што кожны жыхар краіны ведае, любіць, шануе з дзяцінства.

Ідэя адзінства пранізвае ўсю нашу гісторыю. Асабліва гэта адчувалася ў тыя моманты, калі ў краіне здаралася бяда. Так было заўсёды: калі трэба абараняць Бацькаўшчыну, то разам, усёй грамадой. Наогул, гісторыя Беларусі

дваццатага стагоддзя напоўнена такімі падзеямі, што іншым народам хапіла б на некалькі стагоддзяў. Дзве сусветныя вайны віхурай пранесліся па наших землях, нацыю хацелі знішчыць у гарніле генацыду, ды і самая вялікая ў гісторыі чалавецтва тэхнагенная катастрофа закранула беларускія тэрыторыі. Але мы выстаялі, адрадзіліся, адбудаваліся. Захавалі нацыянальную самасвядомасць і суверэнітэт. Толькі разам, толькі як адно цэлае, дзякуючы адзінству, згуртаванасці і патрыятызму.

17 верасня ўвесь беларускі народ адзначае маладое, але такое знамянальнае свята. Напярэдадні па ўсёй краіне праводзяцца акцыі, сустрэчы, урачыстыя мерапрыемствы. Мы, сённяшнія вучні, таксама далучаемся да святкаванняў. Члены ваенна-патрыятычнага клуба нашай школы прымаюць актыўны ўдзел ва ўсіх раённых мерапрыемствах. На такіх масавых сустрэчах заўсёды пануе дух адзінства, салідарнасці, гонару за нашу Радзіму, за наш народ.

Гэта дае маладому пакаленню зразумець, што адзінства – гэта не проста абстрактнае паняцце, а рэальная сіла, здольная змяніць свет да лепшага. Толькі разам, падтрымліваючы і дапамагаючы адзін аднаму, мы зможам перадаць у спадчыну нашчадкам не толькі лепшыя нацыянальныя рысы характару, але ген адзінства.